## ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

**УДК 94(37)** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-67-2-2-5**

# САЛЯРНЫЯ БОГІ АНТЫЧНАЙ ПАЛЬМІРЫ І РЫМСКІ SOL INVICTUS

***С.М. СМІРНОЎ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0003-2212-3178***

*У артыкуле разглядаецца праблема сувязі рымскага бога Sol Invictus і салярных багоў антычнай Пальміры. Выяўленне гэтай сувязі праводзіцца на аснове аналізу звестак сакральнага мастацтва і нумізматычнага матэрыялу. Іканаграфія салярных багоў антычнай Пальміры і Рыма дэманструе рысы падабенства і адрознення паміж гэтымі багамі. Выявы рымскага Sol Invictus падкрэсліваюць яго ваенны і дзяржаўны характар. Пальмірскія багі адначасова з'яўляліся багамі сонца і багамі расліннасці, ураджаю і мясцовай свяшчэннай крыніцай.*

***Ключавыя словы:*** *антычная Пальміра, антычны Рым, рэлігійны сінкрэтызм, рымская рэлігія, Sol Invictus.*

**Уводзіны.** Праблема сувязі пальмірскіх салярных багоў з рэлігійнай рэформай рымскага імператара Аўрэліяна дагэтуль застаецца нявырашанай для сучаснай гістарычнай навукі. Высветліць дадзеную праблему магчыма на грунтоўным аналізе асноўных рыс іканаграфіі салярных багоў антычнай Пальміры і рымскага бога Sol Invictus. Звычайна сярод даследчыкаў дамінуе думка аб сірыйскіх вытоках рэлігійнай рэформы імператара Аўрэліяна [1, p. 155–162; 2; 3]. Гісторыкі антычнай рэлігіі падкрэслівалі ўсходнія карані культу рымскага Sol Invictus. Дадзеная думка грунтавалася на значным спрашчэнні рэлігійнай сітуацыі ў Рымскай імперыі III ст. н. э. Даследчыкі арыентаваліся на звесткі рымскіх гісторыкаў, якія маглі негатыўна ацэньваць захапленне рымскіх імператараў арыентальнымі культамі. (Dio Cass LXXIX 8-1; Herodian V 6; SHA Heliogab., III 4-5) [4, c. 351; 3, c. 205–208; 5, c. 136]. Пазіцыя рымскіх гісторыкаў адлюстроўвае стаўленне кансерватыўных колаў палітычнай эліты Рымскай імперыі, але не раскрывае поўную карціну духоўнага жыцця рымскага грамадства.

Французскі археолаг А. Сейрыг лічыў малаверагоднай гіпотэзу аб сірыйскім паходжанні культу Sol Invictus. На думку даследчыка, салярныя багі рымскай Сірыі саступалі вяршэнства ў мясцовым пантэоне нябесным багам – Белу і Баалшаміну [7]. На падставе аналізу іканаграфіі Sol Invictus С. Э. Хійманс імкнуўся даказаць рымскі характар культу салярнага бога [8, p. 71–103]. Крытычныя заўвагі даследчыка выклікалі пярэчанні іншых гісторыкаў рымскай рэлігіі, якія адстойвалі думку аб сірыйскім паходжанні культу рымскага бога, або высоўвалі канцэпцыю аб цеснай сувязі мітраізму і Sol Invictus [10; 11, p. 85–126; 12, p. 186–187]. Канцэпцыя дзяржаўнага мітраізму ў рэформе імператара Аўрэліяна найлепш прадстаўлена ў працы расійскага даследчыка М.Я. Шанцова [13].

**Асноўная частка**. Пальмірскі пантэон з'яўляецца яскравым прыкладам узаемадзеяння розных рэлігійных і культурных традыцый у элліністычным і рымскім свеце. Сярод пальмірскіх багоў вылучаліся два салярныя багі Яргібол і Малакбел, якія ўваходзілі ў розныя трыяды вярхоўных багоў антычнай Пальміры. Сонечны бог Яргібол фігураваў у трыядзе пальмірскага бога неба Бела разам з богам месяца Агліболам. Пальмірскі бог Малакбел разам з Агліболам уваходзіў у трыяду Баалшаміна, які меў фінікійскае паходжанне. Савецкі даследчык І. Шыфман лічыў, што ў даэлліністычную эпоху Малакбел і Яргібол складалі адзінае сонечнае бoства. Потым у элліністычны перыяд Малакбел стаў асобным богам і вылучыўся з культу Яргібола [14, c. 32]. Заходнія даследчыкі мяркуюць, што абодва багі першапачаткова мелі рознае паходжанне і не складалі адзінае бoства, але набылі падобныя функцыі падчас сваёй эвалюцыі ў элліністычны і рымскі перыяд [15, p. 71–83]. На думку Х. Тэйшыдара, на культы салярных багоў Пальміры значна паўплывала вавілонская і парфянская культура [16, p. 29–52, 64–71].

Сакральнае мастацтва антычнай Пальміры дэманструе складаную эвалюцыю іканаграфіі Яргібола і Малакбела. Гэтая эвалюцыя адлюстроўвае змены ў рэлігійных уяўленнях мясцовых жыхароў, якія адбываліся ў элліністычны і рымскі перыяд гісторыі старажытнай Пальміры. Першапачаткова Яргібол і Малакбел не выконвалі функцыю салярных багоў. Сакральнае мастацтва і пальмірская эпіграфіка сведчаць, што Яргібол з'яўляўся богам вады і ўраджаю, апекуном крыніцы Эфка ў пальмірскім аазісе [16, p. 29–34; 15]. Культ Яргібола цесна звязваўся з традыцыйным шанаваннем бетыляў або мацэб, якія з'яўляліся свяшчэннымі камянямі і месцам прыбывання самога бога або яго фізічнай прысутнасці ў гэтай мясціне. Вобраз свяшчэннага каменя меў пальмірскі бог месяца Аглібол, які разам з Яргіболам з'яўляўся апекуном пальмірскай крыніцы. Пальмірскія тэсеры паказваюць, што над выявамі бетыляў Яргібола і Аглібола лунаюць зорка і паўмесяц [17]. Дадзеныя выявы дазваляюць казаць аб суіснаванні архаічнага і салярнага аспекту Яргібола. Выява зоркі на пальмірскіх тэсерах з'яўляецца салярным сімвалам, які падкрэслівае сонечны аспект пальмірскага Яргібола. Сувязь двух аспектаў гэтага бога заўважна на выяве ўзброенага бога з прамяністым німбам са стэлы пальмірскага свяцілішча ў Дура-Еўропас. Гэтая выява суправаджаецца надпісам, у якім Яргібол названы добрым богам і мацэбай пальмірскай крыніцы Эфка [16, p. 170; 15].

Другі салярны бог антычнай Пальміры – Малакбел – першапачаткова быў богам расліннасці. Разам з Агліболам выконваў функцыю апекуна аднаго з чатырох плямён старажытнай Пальміры. Культ Малакбела і Аглібола меў агульную святыню "Свяшчэнныя сады", якая дагэтуль не знойдзена археолагамі, але часта згадваецца ў пальмірскім эпіграфічным матэрыяле [16, p. 34–52; 16].

Асноўныя рысы іканаграфіі Малакбела прадстаўлены на шматлікіх помніках сакральнага мастацтва антычнай Пальміры. Архаічны аспект Малакбела заўважны на рэльефе з храма вярхоўнага бога пальмірскага пантэону Бела [16, p. 173; 18; 19, p. 157–189]. Дадзены рэльеф прадстаўляе сабой сцэну саюзу і прымірэння паміж Малакбелам і Аглібoлам. Абодва багі стаяць у атачэнні алтароў з пладамі зямлі, а за Малакбелам стаіць кіпарыс, які з'яўлялся свяшчэнным дрэвам гэтага бога. Алтары з пладамі зямлі і свяшчэннае дрэва пальмірскага бога падкрэсліваюць яго функцыю апекуна ўраджаю і расліннасці. На выяве пальмірскага алтара заўважна, што бог Аглібол – гэта ўзброены ваяр з прамяністым німбам з паўмесяцам, а Малакбел апрануты ў мясцовую сялянскую вопратку. Падобны характар мае выява Малакбела і Аглібола з пальмірскага рэльефу, які знаходзіцца ў Рыме [7; 18]. Узброены Аглібол з паўмесяцам паціскае руку Малакбелу ў сялянскай вопратцы. Сцэна прымірэння і саюзу двух свяшчэнных братоў суправаджаецца выявай кіпарыса. Захоўваецца кантраст паміж гэтымі багамі, які можна патлумачыць тым, што Аглібол, магчыма, выконваў ролю старэйшага брата ў саюзе двух багоў. Лідарства бога месяца заходнія даследчыкі А. Сейрыг і Я. Вайс тлумачылі істотным уплывам вавілонскай культуры на рэлігійнае жыццё старажытнай Пальміры [7; 18].

Яскрава заўважны салярны аспект Малакбела на пальмірскім рэльефе з калекцыі Луўра [16, p. 168]. На дадзеным рэльефе пальмірскі бог Малакбел мае сонечны прамяністы німб і вайсковую форму, ён суправаджае ўзброеных багоў Баалшаміна і Аглібола. Пальмірскі алтар у Рыме раскрывае пэўныя дэталі міфалогіі Малакбела [7; 16, p. 175–176]. На першым баку алтара прысутнічае сцэна нараджэння пальмірскага бога з кіпарыса, які суправаджаў Малакбела ў сакральным мастацтве антычнай Пальміры. Малакбел выходзіць з дрэва ў выглядзе боскага дзіцяці і трымае на плячах казу. Дадзеная сцэна адлюстроўвае істотнае значэнне архаічнага аспекту Малакбела ў яго міфалогіі і ў сістэме вераванняў старажытных пальмірцаў. Другі бок алтара паказвае маладога бога, які сядзіць у калясніцы, запражонай грыфонамі. Грыфон часта суправаджаў Малакбела ў помніках сакральнага мастацтва Пальміры. Сувязь сонечнага аспекту Малакбела з грыфонам заўважна на алтары са святыні Баалшаміна ў Пальміры [18]. Салярны характар пальмірскага бога падкрэсліваецца тым, што Малакбел кіруе сонечнай калясніцай. Трэці бок дадзенага алтара дэманструе Малакбела з прамяністым німбам у суправаджэнні арла, што адпавядае традыцыйнай іканаграфіі рымскага Sol Invictus і грэчаскага бога Геліяса і, у пэўнай ступені, іканаграфіі сонечнага бога Элагабала на агульнаімперскай чаканцы (RIC IV. II. Elagabalus. № 195) [20]. Апошні, чацвёрты бок алтара паказвае Малакбела ў выглядзе рымскага бога Сатурна з сярпом, які лічыўся начным сонцам. У вобразе Сатурна Малакбел фігуруе на пальмірскіх тэсерах і рэльефе адытона з храма бога Бела ў Пальміры [18; 21]. Выявы на пальмірскіх тэсерах пацвярджаюць цесную сувязь салярнага і расліннага аспекту пальмірскага бога, якую можна заўважыць на выявах пальмірскага алтара. Згодна з міфалагічнымі сцэнамі Малакбел нараджаецца са скалы як бог і апякун расліннасці і прыроды, потым атрымлівае атрыбуты сонечнага бога, а пасля становіцца начным сонцам і адраджаецца наступнай раніцай. Выявы пальмірскага алтара ў Рыме суправаджаюцца пасвячальнымі надпісамі на арамейскай і лацінскай мовах. Лацінскі надпіс сцвярджае, што гэты алтар пасвечаны ў гонар Малакбела, які атрымлівае найменне Deo Soli Sanctissimo [7; 18]. Пасвячальныя надпісы і выявы чатырох бакоў алтара яскрава пацвярджаюць суіснаванне двух аспектаў пальмірскага бога. У сістэме пальмірскіх вераванняў Малакбел адначасова з'яўляўся богам расліннасці і сонца. Міфалагічныя сюжэты пальмірскага бога ўтрымлівалі абодва аспекты і дэманстравалі сувязь пальмірскай рэлігіі з рэлігійным жыццём Рымскай імперыі ў I – III ст. н. э. Пальмірскі алтар у Рыме – гэта яскравае сведчанне ўзаемадзеяння пальмірскай і рымскай рэлігійных традыцый у асяродку пальмірцаў, якія служылі ў рымскім войску. Салярны аспект Малакбела і Яргібола, на думку А. Сейрыга і Х. Тэйшыдара, фармаваўся пад значным уплывам традыцыі грэчаскай, потым рымскай рэлігій і імператарскага культу [7; 16, p. 29–34].

Іканаграфія рымскага бога Sol найлепш прадстаўлена ў нумізматычным матэрыяле рэспубліканскага і імператарскага Рыму. Падчас разгляду і аналізу дадзенага матэрыялу, заўважаецца істотнае падабенства іканаграфічных рысаў рымскага бога сонца і салярных багоў Пальміры. Але грунтоўны аналіз характару выяў Sol Invictus на рэспубліканскай і імперскай чаканцы дазваляе выявіць адрозненне ў іканаграфіі гэтых багоў. Звычайна на манетах рэспубліканскага і імператарскага перыяду сонечны бог заўжды выступае як малады мужчына ў прамяністай кароне або німбе. Часцей сустракаюцца сцэны, у якіх малады бог стаіць і трымае ў руцэ сферу, або пугу, маланкі, лук ці калчан. Салярны бог можа стаяць з паднятай правай рукой, што нагадвае позу імператара, які вітае рымскае войска. Гэтыя традыцыйныя рысы іканаграфіі сонечнага рымскага бога сустракаюцца на манетах рэспубліканскага перыяду. На гэтых манетах рымскі сонечны бог Sol кіруе квадрыгай і мае прамяністы німб (RRC I. 250.1; 309.1) [22]. Эпоха прынцыпату не змяніла істотным чынам іканаграфію Sol Invictus. На аверсе манеты імператара Веспасіяна прысутнічае выява салярнага бога ў прамяністым німбе, а на зваротным баку – выява самаго імператара (RIC II. Vespasian № 28) [20]. Гэтая манета дэманструе цесную сувязь салярнага бога з асобай рымскага імператара. Такая сувязь лепш заўважна ў збліжэнні выяў рымскіх імператараў з іканаграфічным узорам сонечнага бога Рымскай імперыі (RIC II. Trajan № 72, 139-141) [20]. На манетах імператараў Адрыяна і Комада таксама прысутнічаюць выявы Sol, які суправаджаецца тытулатурай рымскіх імператараў або легендай Oriens Augusti (RIC II. Hadrian № 16, 20, 145, 167; RIC III. Commodus № 119) [20].

Роля салярнага бога у рэлігійнай і палітычнай прапагандзе рымскіх імператараў значна ўзрастае падчас падзеі III ст. н. э. На манетах імператараў дынастыі Севераў выява сонечнага бога суправаджаецца легендамі: Rector Orbis, Pacator Orbis (RIC IV I. Septimius Severus № 102, 117, 282, 287) [20]. Тыповыя рысы іканаграфіі рымскага бога сонца прысутнічаюць на манетах імператара Каракалы (RIC IV I. Caracalla № 39, 40) [20]. На гэтах манетах рымскі бог мае прамяністы німб, або карону, кіруе квадрыгай, стаіць і трымае ў руцэ сферу. Парушае рымскую традыцыю імператар Элагабал, чаканка якога адначасова дэманструе два вобразы: традыцыйны антрапаморфны рымскі вобраз і вобраз свяшчэннага каменя з сірыйскай Эмесы (RIC IV II. Elagabalus № 17, 143) [20].

Але пасля смерці рымскага імператара эмескі вобраз салярнага бога знікае з агульнаімперскай чаканкі. Рымскі бог на манетах імператара Элагабала атрымаў эпітэты Conservatori Augusti, Sancto Deo Soli Elagabali, Soli Propugnatori, якія сведчылі пра значную ролю салярнага культу ў рэлігійнай палітыцы рымскага імператара (RIC IV II. Elagabalus № 61, 62, 143, 198) [20]. Падчас кіравання імператара Аляксандра Севера салярны бог на манетах выступае ў сваім традыцыйным рымскім вобразе (RIC IV II. Severus Alexander № 4, 100, 101, 106, 109-120) [20]. Тое ж самае можна сказаць пра выявы на манетах імператараў эпохі крызісу III ст. н. э. Салярны бог прысутнічае на манетах імператара Валерыяна, які з'яўляўся прыхільнікам рымскага традыцыяналізму (RIC V. I. Valerian № 2, 46, 170) [20]. Выявы рымскага бога Sol суправаджаюць чаканку імператара Галіена, рэлігійнага палітыка якога характарызуецца большай прыхільнасцю да сінкрэтычных тэндэнцый у духоўным жыцці Рымскай імперыі. На манетах гэтага імператара салярны бог атрымлівае легенды Soli Invicto, Oriens Augusti, Aeternitas Augusti (RIC V. I. Gallienus (sole reign) № 62, 113, 119) [20]. Рымскі імператар падкрэсліваў значнасць шанавання салярнага бога для ўмацавання прэстыжу імператарскай улады. Дадзеныя крокі ў рэлігійнай і палітычнай прапагандзе Галіена мусілі пацвердзіць паспяховасць кіравання гэтага імператара, што не адпавядала рэальнаму становішчу ў Рымскай імперыі. Выявы салярнага бога на манетах імператара Аўрэліяна не супярэчаць традыцыям рымскай і эліністычнай іканаграфіі гэтага бога (RIC V. I. Aurelian № 6, 17, 20, 54, 64) [20]. Звесткі Гісторыі Аўгустаў і рымскага гісторыка Зосіма падкрэсліваюць значнасць рэлігійных мерапрыемстваў Аўрэліяна, які ўвёў афіцыйны публічны культ бога Sol Invictus (SHA Aurelian XXV, 4-6; Zos. 1. 61) [6, с. 82–83; 23, с. 90]. Манеты імператара Аўрэліяна дазваляюць вызначыць рымскага сонечнага бога як ахоўніка дзяржавы, асабістага апекуна імператара і спадарожніка яго вайсковых перамог. Нумізматычны матэрыял бясспрэчна дэманструе сувязь асобы імператара з салярным культам. Рэлігійная рэформа Аўрэліяна мусіла падкрэсліць звышнатуральны характар імператарскай улады.

Іканаграфія салярных багоў Рыма і Пальміры дэманструе сувязь паміж гэтымі багамі. На помніках сакральнага мастацтва, салярныя багі з'яўляюцца ўзброенымі ваярамі або маюць яскравыя вайсковыя атрыбуты, але значнае падабенства іканаграфій не скасоўвае адрознасць паміж імі. На падставе аналізу нумізматычнага матэрыялу II і III ст. н. э. рымскі салярны бог не быў звязаны з шанаваннем расліннасці і ўраджаю, як гэта праяўлялася ў архаічных аспектах Яргібола і Малакбела. Іканаграфія рымскага бога Sol заўжды трымаецца ў рэчышчы рымскіх і эліністычных традыцый. Іканаграфія сонечных багоў антычнай Пальміры фарміравалася пад значным уплывам грэка-рымскай традыцыі, а не наадварот. Малаверагодным выглядае тое, што Яргібол або Малакбел сталі тым сонечным богам, культ якога набыў афіцыйны і агульнаімперскі характар падчас рэлігійнай рэформы імператара Аўрэліяна. Больш слушнай падаецца думка, што салярныя багі на прасторах Рымскай імперыі станавіліся мясцовымі варыяцыямі рымскага бога сонца. Магчыма, мясцовыя культы набылі рымскую форму і такім чынам адаптаваліся да рымскіх, або грэчаскіх рэлігійных традыцый. Рэлігійны сінкрэтызм выступаў як складаны шматгранны працэс дыялогу паміж рэлігійнымі і культурнымі традыцыямі розных этнічных супольнасцей Рымскай імперыі.

Іканаграфія салярных багоў антычнага Рыма і Пальміры мае агульныя рысы з іканаграфіяй грэчаскага сонечнага бога Геліяса на правінцыяльнай чаканцы Рымскай імперыі. Манеты рымскіх правінцый дазваляюць судзіць аб тыповых рысах іканаграфіі грэчаскага Геліяса і рымскага бога сонца. Салярны бог, які кіруе квадрыгай, прадстаўлены на манетах з грэчаскага Карынфа (RPC I Nero. № 1196, RPC II Domitian № 170; RPC IV. 1. Antonius Pius № 5093), з Егіпту (RPC III Trajan. № 4730), з Кілікіі (RPC VI Severus Aexander № 6885; RPC VII. 2 Gordian III № 2426) [24]. Правінцыяльныя манеты з Іспаніі (RPC I. Roman Republic № 266), з Егіпту (RPC II Domitian № 2519), Лідзіі (RPC IV. 2 Antoninus Pius № 1628; RPC VI Elagabalus № 4490) суправаджаюцца выявамі сонечнага бога, які мае прамяністаю карону ці прамяністы німб [24]. Часам правінцыяльная чаканка дэманструе нестандартныя рысы іканаграфіі салярнага бога Рымскай імперыі. На егіпецкай манеце часоў кіравання імператара Даміцыяна заўважаецца атаясамленне Геліяса і Сераціса (RPC II Domitian № 2519), што можна растлумачыць як праяву ўнутранага сінкрэтызму ў эліністычным і рымскім Егіпце [24]. У егіпецкай правінцыяльнай чаканцы Геліяс суправаджаецца выявамі Сераціса і Селены, задыякальнага Льва (RPC IV. 4 Antonius Pius № 16732, 14870; RPC VI Severus Alexander № 4679) [24]. Сярод правінцыяльных манет сустракаецца выява рымскага імператара Комада ў позе сонечнага бога Геліяса і з атрыбутамі Геракла (RPC IV 4. Commodus. № 15626) [24]. На манетах рымскай правінцыі Лідзіі часоў кіравання Аляксандра Севера сонечны бог Геліяс кіруе львінай калясніцай (RPC VI Severus Alexander № 4376) [24].

**Заключэнне**. Разгляд іканаграфіі багоў сонца антычнай Пальміры і Рыма на падставе звестак сакральнага мастацтва і нумізматычнага матэрыялу дазваляе выказаць меркаванні аб паспешлівасці і неабгрунтаванасці гіпотэзы ўсходняга паходжання рымскага салярнага бога Sol Invictus. Гэтае меркаванне грунтавалася на значнай абсалютызацыі кансерватыўнай пазіцыі прадстаўнікоў рымскай інтэлектуальнай эліты, якая крытычна ставілася да рэлігійнай палітыкі рымскіх імператараў II – III ст. н. э. Гісторыкі рымскай рэлігіі перабольшвалі ўплыў усходняй рэлігійнай традыцыі на духоўную культуру Рымскай імперыі і не заўважылі шматграннасць рэлігійнага сінкрэтызму як працэсу міжкультурнага дыялогу на прасторах імперыі.

Аналіз звестак сакральнага мастацтва і нумізматычнага матэрыялу адначасова ўказвае на значнае падабенства і адрозненне паміж салярнымі багамі антычнага Рыму і Пальміры. Багі мелі прамяністы німб, кіравалі сонечнай калясніцай і дэманстравалі яскравы ваенны аспект, але іканаграфія салярных багоў адрознівалася, бо Яргібол і Малакбел захоўвалі сваю функцыю багоў расліннасці, ураджаю, лакальных багоў пальмірскага аазісу. Архаічны аспект пальмірскіх багоў быў цесна звязаны з аспектам багоў сонца, што адлюстравана на помніках сакральнага мастацтва старажытнай Пальміры. У сваю чаргу, рымскі сонечны бог не меў атрыбутаў бога расліннасці і ўраджаю. Рымскі Sol Invictus – гэта дзяржаўны бог, цесна звязаны з шанаваннем імператарскай улады, вайсковымі і палітычнымі поспехамі Рымскай імперыі. Агульнаімперская чаканка I – III стст. н. э. яскрава дэманструе сувязь

асобы імператара і салярнага культу, які набываў значную папулярнасць сярод рымскіх вайскоўцаў. Але іканаграфія рымскага сонечнага бога заставалася ў рэчышчы рымскіх і грэчаскіх традыцый, прадстаўленых у правінцыяльнай чаканцы Рымскай імперыі. Іканаграфія пальмірскіх багоў фарміравалася пад уздзеяннем элiністычнай і рымскай культур, але захоўвала мясцовыя асаблівасці.

ЛІТАРАТУРА


1. Halsberghe G. H. The cult of Sol Invictus. – Leiden: E. J. Brill, 1972. – 192 p.
2. Momigliano A. Manuale di storia romana. – Torino: Utet Università, 2011. – 286 p.
3. Watson A. Aurelian and Third century. – London, New York: Routledge, 1999. – 324 p.
4. Кассий Дион Коккейан. Римская история. Книги LXIV–LXXX / пер. с древнегреч. А.В. Махлаюка. – СПб.: Филфак СПбГУ, 2011. – 456 с.
5. Геродиан. История императорской власти после Марка в восьми книгах / пер. с древнегреч. А. И. Доватура [и др.]. – СПб.: Алетейя, 1995. – 289.
6. Властелины Рима. Биография римских императоров от Адриана до Диоклетиана / пер с лат. С.П. Кондратьева. – СПб.: Алетейя, 2001. – 384 с
7. Seyrig H. Iconographie de Malakbêl // Antiquités syriennes. Syria. – T. 18, fascicule 2, 1937. – P. 198–209. DOI: https://doi.org/10.3406/SYRIA.1937.3969 .
8. Hijmans S. Sol: The Sun in the Art and Religions of Rome. PhD dissertation. – Groningen, 2009. – 664 p.
9. Амбрамзон М.Г. Монеты как средство пропаганды официальной политики Римской империи. – М.: Ин-т археологии РАН, 1995. – 748 с.
10. Mattern P. Helios und Sol. Kulte und Ikonographie des griechischen und römischen Sonnengottes. – Istanbul: Ege, 2002. – 366 p.
11. Berrens S. Sonnenkult und Kaisertum von den Severern bis zu Constantin I. (193–337 n. Chr.). – Stuttgart: Franz Steiner Verlag, 2004. – 283 p.
12. Manfred C. Kaiser und Gott: Herrscherkult im römischen Reich. – Leipzig: K. G. Sauer München, 2001. – 597 p.
13. Шенцов М.Е. Культ Митры в Риме в III в. И религиозная политика императора Аврелиана: автореф. дис.… канд. ист. наук: 07.00.03 / НИУ БелГУ. – Белгород, 2013. – 24 с.
14. Шифман И.Ш. Введение // Пальмирский пошлинный тариф. / пер. с древнегреч. и арам. И.Ш. Шифмана. – М.: Наука, 1980. – С. 3–96.
15. Grassi M. T. Palmira: storit straordinarie dell'antica metropoli d'Oriente. – Milano: ed. Edizioni Terra Santa, 2017. – 160 p.
16. Teixidor J. The pantheon of Palmyra. – Leiden: E. J. Brill, 1979. – 195 p.
17. Lukasiak E. Ikonografia Yarhibola // Studia Palmyreńskie. – 1974. – № 5. – S. 7–44. DOI: https://doi.org/10.11588/DIGLIT.26181.5.
18. Wais J. Problemy ikonografii Malakbela //Studia Palmyreńskie. – 1970. – № 4. – S. 5–69. DOI: https://doi.org/10.11588/DIGLIT.26180.4.
19. Dirven L. The Palmyrenes of Dura-Europos: A Study of Religious Interaction in Roman Syria. – Leiden: Brill, 1999.
20. The Roman Imperial Coinage (RIC): in 10 v. / ed. H Mattingly, E. A. Sydenham. – London: Spink&Son, 1936–1994. – 10 vol.
21. Brykczyński P. Astrologia w Palmyrze // Studia Palmyreńskie. – 1975. – № 6-7. – S. 47–109. DOI: https://doi.org/10.11588/DIGLIT.26421.7.
22. The Roman Republican Coinage (RRC): in 2 v. / ed. M. C. Crawford. – Cambridge: Cambridge Univ. Press, 1974-2008. – 2 vol.
23. Зосим. Новая история / пер. с древнегреч., комм., указ. Н.Н. Болгова. – Белгород: Изд-во Белгород. гос. ун-та, 2010. – 344 с.
24. Roman Provincial Coinage online (RPC) [Electronic resource]. – URL: https://rpc.ashmus.ox.ac.uk/. (Date of access: 28.12.2021).
25. Epigraphik-Datebank Clauss/Slaby. [risorsa elettronico] – URL: http://www.manfredclauss.de/gb/index.html (Data d'acceso: 01.02.2022).


*Пастуniў 30.08.2022*

## СОЛЯРНЫЕ БОГИ АНТИЧНОЙ ПАЛЬМИРЫ И РИМСКИЙ SOL INVICTUS

***С.Н. СМИРНОВ***
***(Белорусский государственный университет, Минск)***

*В статье рассматривается проблема связи римского бога Sol Invictus и солярных богов античной Пальмиры. Выявление этой связи проводится на основе анализа свидетельств памятников сакрального искусства и нумизматического материала. Иконография солярных богов античной Пальмиры и Рима демонстрирует черты схожести и отличия между этими богами. Изображения римского Sol Invictus подчеркивают его военный и державный характер. Пальмирские боги одновременно являлись богами солнца и богами растительности, урожая и местного священного источника.*

***Ключевыя слова:*** *античная Пальмира, античный Рим, религиозный синкретизм, римская религия, Sol Invictus.*

## SOLAR GODS OF ANCIENT PALMYRA AND THE ROMAN SOL INVICTUS

***S. SMIRNOU***
***(Belarussian State University, Minsk)***

*The article deals with the problem of the association of the Roman god Sol Invictus and the solar gods of ancient Palmyra. The identification of this association is carried out on the basis of an analysis of the evidence of sacred art and numismatic material. The iconography of the solar gods of ancient Palmyra and Rome demonstrates similarities and differences between these gods. Images of the Roman Sol Invictus clearly indicate his military and state character. The Palmyrene gods were at the same time the gods of the sun and the gods of the plant world, also affecting the local sacred source.*

***Keywords:*** *ancient Palmyra, ancient Rome, religious syncretism, Roman religion, Sol Invictus.*